Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

5 ЛІПЕНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 124 (28991)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЯК ПАДЛІЧВАЛІ БАЛЫ НА ЦТ?

3

НАРЫХТОЎКІ: ШТО ПАЧЫМ

ЦЫТАТА ДНЯ

Ірына БАБАЧОНАК, дырэктар Дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі:

«На працягу бліжэйшых трох месяцаў у краіне павінны будуць з'явіцца праекты дакументаў — ад указа кіраўніка дзяржавы да ўсіх неабходных падзаконных прававых актаў, — якія прапішуць новую сістэму падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Мінэканомікі разлічвае на актыўны ўдзел мясцовых органаў улады, грамадскасці, міжнародных экспертаў у абмеркаванні дадзенай тэмы. Плануецца ўнесці змены ў вызначэнні, якія характарызуюць інфраструктуру падтрымкі прадпрымальніцтва, адпаведныя паслугі, механізм аказання падтрымкі».

Пленэр на Ніжне-Пакроўскай

Фота Анатоля КІПЕЧУКА.

Вучаніцы розных полацкіх школ Аліна ЛУГІНА, Лера ЛАПАНОВІЧ, Аляксандра ГОЛУБЕВА і Марыя ГАЛОТА ўжо сем гадоў займаюцца ў дзіцячай мастацкай школе пад кіраўніцтвам члена Беларускага Саюза мастакоў Івана Іванова. Летам юныя мастачкі абавязкова ўдзельнічаюць у пленэрах, якія праходзяць у розных куточках старажытнага горада, малююць архітэктуру і разам з тым засвойваюць гісторыю свайго Полацка. Цяпер дзяўчынкі замалёўваюць абрысы цагляных будынкаў на Ніжне-Пакроўскай — адной са старажытных і добра захаваных вуліц Полацка.

КОРАТКА

- **Творчую спадчыну архітэктара Леаніда Левіна прадставяць на выстаўцы ў Хатыні.**
- Bitcoin расходуе электраэнергіі больш, чым Швейцарыя. Прыведзеныя звесткі паказваюць, што 0,21 % сусветнай электраэнергіі ідзе на здабычу электроннай валюты.
- **У Рагачоўскім раёне згарэла 340 тон сена.**

- Эстонская IT-кампанія з офісам у Мінску распрацавала міжнародна-значны дадатак для барацьбы з карупцыяй.
- **Больш за 73,3 тысячы гектараў сельскагаспадарчых культур пашкоджана засухай у Гомельскай вобласці.**

Фестывалім

Па папараць-кветку — у Александрыю

Заўтра, 6 ліпеня, у Шклоўскім раёне пачнецца вялікае рэспубліканскае свята — «Купалле» («Александрыя збірае сяброў»).
Пройдзе яно ўжо ў дзясяты раз. Сустрэча сяброў адбудзецца на тым самым месцы, што і заўсёды, — на маляўнічай лугавіне на беразе Дняпра, які падзяляе мяжу Магілёўскай і Віцебскай абласцей. Галоўнай тэмай свята гэтым разам стане трохгоддзе малой радзімы, а мерапрыемстваў у праграме так шмат, што ўсе два выхадныя дні распісаны па хвілінах.

СТАР. 3

Фота БелТА.

Сучасныя тэхналогіі

ЭЛЕКТРАДОМ, САМАКАТ І ПАРАГЕНЕРАТАР

для эфектыўнага выкарыстання электрычнай энергіі

Амаль увесь гарадскі грамадскі транспарт у Беларусі з цягам часу стане працаваць на электрацязе, а на работу будзе зручней ездзіць на электрасамакатах, чым на аўто. У Брэсцкай вобласці з'явіцца 14 дамоў цалкам на электраэнергіі, а яе спажыванне ў краіне ў цэлым штогод можа павялічвацца на 400 млн кВт·г. Такія думкі агучвалі спецыялісты падчас прэзентацыі сёлетніх праектаў, прадстаўленых на конкурс «Лідар энергаэфектыўнасці — 2019».

ІНАВАЦЫЯ, САБЕКОШТ, ЭНЕРГАЭФЕКТЫЎНАСЦЬ...

Усе планы і новаўвядзенні ў галіне энергетыкі разглядаюцца з арыенцірам на хуткі запуск Беларускай АЭС.

— Энергія, што будзе вырабляцца на атамнай станцыі, павінна быць эфектыўнай. Увод АЭС патрабуе ад нас кансалідацыі высілкаў для павелічэння спажывання электраэнергіі ў межах эфектыўных праектаў, якія дазволяць не толькі павялічыць яе спажыванне, але і павысіць якасць прадукцыі і яе канкурэнтаздольнасць, — адзначыў **Леанід ПАЛЯШЧУК, намеснік дырэктара Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Дзяржкамітэта па стандартызацыі Беларусі.**

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X